- по данным оценки внешней, внутренней и общей конфликтности осуществления ценностей в результате проведенной формирующей работы все показатели конфликтности у подростков ЭГ из высокого и среднего уровней перешли на низкий уровень ($p<0,05$), то есть восприятие школьниками конфликтности (трудностей) в достижении значимых для них ценностей существенно снизилось;

- было выявлено некоторое снижение в оценке роли внешних причин на реализацию ценностных предпочтений подростков ЭГ при одновременном повышении роли внутренних резервов что является тенденцией к пониманию своего «Я», реальной оценке своих возможностей и способностей, пониманию того, что прикладывая большие усилия, можно добиться более высоких результатов и в конечном итоге осуществления своих мечтаний.

**Заключение.** Результаты проведенного исследования позволяют рекомендовать разработанный и апробированный диагностический комплекс и экспериментальную формирующую программу психолого-педагогического сопровождения учащихся, в учебной деятельности и в процессе общения со сверстниками, направленную на развитие ценностных ориентаций подростков, для внедрения в общеобразовательных школах.

Список литературы

1. Романова Э.Н. Развитие Я-концепции у детей подросткового возраста // Э.Н. Романова, С.А.Гапонова // Мир науки, культуры, образования. – Горно-Алтайск, 2012. – Ч.1. – № 2 (33). – С.107–109.
2. Романова Э.Н. Специфика развития учебной деятельности в подростковом возрасте // Инициативы XXI века. – М., 2012. – №1. – С. 156–158.
3. Романова Э.Н., Развитие ценностных оснований личности в современной социокультурной ситуации // Сборник научных трудов к 100-летию Нижегородского государственного педагогического университета. – Н.Новгород, 2010. – С.67–70.
4. Романова Э.Н., Изучение ценностных ориентаций личности в отечественной психологии // Менеджмент качества образования в условиях обновляющейся России: сб. науч. ст. – Екатеринбург: Изд-во Урал. гос. экон. ун-та, 2011. – Вып. 5. – С. 250–254.
5. Романова Э.Н., Развитие духовно-нравственных ценностей современных подростков // Подготовка инновационных кадров для рынка труда в условиях непрерывного образования: материалы Международной научно-практической конференции. – Екатеринбург: Изд-во Урал. гос. экон. ун-т, 2012. – С. 212–214.
6. Романова Э.Н., Активное социально-психологическое обучение в вузе // Учебное пособие для преподавателей. – Н.Новгород, 2012. – 72 с.

# ПАДРЫХТОЎКА БУДУЧЫХ НАСТАЎНІКАЎ ДА ВЫКАРЫСТАННЯ МУЛЬТЫМЕДЫЙНЫХ СРОДКАЎ НА ЎРОКАХ “МАЯ РАДЗІМА – БЕЛАРУСЬ”

*Т.А. Данілевіч, Л.В. Яршова*
*Орша, Аршанскі каледж ВДУ імя П.М. Машэрава*

Вывучэнне змястоўнага блоку ведаў “Мая Радзіма – Беларусь” накіравана на стварэнне ў малодшых школьнікаў гістарычных вобразаў, якія фарміруюцца ў свядомасці вучняў у выніку складанай псіхічнай дзейнасці: адчуванняў, успрыманняў, памяці, фантазіі, эмоцый, асэнсавання гістарычнага матэрыялу. У сучасным адукацыйным працэсе станоўча ўплываюць на фарміраванне ў вучняў вобразаў мінулага мультымедыйныя сродкі. У навукова-метадычнай літаратуры адсутнічае сістэмны аналіз праблемы іх выкарыстання пры вывучэнні гістарычнай прапедэўтыкі. Таму праблема падрыхтоўкі будучых настаўнікаў да выкарыстання мультымедыйных сродкаў на ўроках “Мая Радзіма – Беларусь” з’яўляецца актуальнай.

**Матэрыял и метады**. Мэтай дадзенага даследвання з’яўляецца вызначэнне ролі мультымедыйных прэзентацый і відэафільмаў пры вывучэнні гістарычных асоб на ўроках “Мая Радзіма – Беларусь” і методыкі іх выкарыстання. Метады даследвання – аналіз навукова-метадычнай літаратуры, педагагічнага вопыту, мадэліраванне.

**Выниікі і іх абмеркаванне.** Фарміраванне ўяўленняў аб гістарычнай з’яве і асобе ажыццяўляецца як з дапамогай славесных метадаў (апавяданне, апісанне, характарыстыка), так і метадаў нагляднага навучання (дэманстрацыя, ілюстрацыя). Вывучэнне падзей мінулага ўскладняецца для малодшых школьнікаў у сувязі з адсутнасцю неабходных уяўленняў. І мультымедыйныя прэзентацыі і відэафільмы выступаюць як эфектыўны сродак нагляднага навучання, таму што робяць для школьнікаў даступнымі гістарычныя вобразы. Мультымедыйныя сродкі навучання спалучаюць у сабе дынаміку, гук, выяўленне, што забяспечвае ўтрыманне ўвагі дзяцей на ўроку. Адначасовае ўздзеянне інфармацыі на слых і зрок дазваляе дасягнуць эфектыўнасці працэсу ўспрымання [1, с. 12].

Для настаўнікаў пачатковай школы ствараюцца электронныя адукацыйныя рэсурсы, якія яны могуць выкарыстоўваць на ўроках (“Пад сценамі старажытных замкаў”, “Славутыя імёны Бацькаўшчыны” і інш.) [2]. На адукацыйных сайтах Internet можна знайсці прыклады

Репозиторий ВГУ

створаных настаўнікамі-энтузіястамі мультымедыйных прэзентацый, але яны патрабуюць крытычнага аналізу як з пункту гледжання методыкі выкладання гісторыі, так і псіхолага-педагагічных патрабаванняў. Самастойнае стварэнне мультымедыйных прэзентацый патрабуе адпаведных ведаў у галіне інфармацыйных тэхналогій. Таму пры вывучэнні методыкі выкладання змястоўнага блоку ведаў "Мая Радзіма – Беларусь" трэба навучыць будучых настаўнікаў пошуку і крытычнаму асэнсаванню відэаматэрыялаў у сетцы Internet, методыцы стварэння і выкарыстання тэматычных мультымедыйных прэзентацый на ўроках на базе ведаў аб інфармацыйных тэхналогіях, якія яны набылі на занятках такіх дысцыплін як інфарматыка, інфармацыйныя тэхналогіі і ў самастойнай рабоце.

Асаблівую ўвагу трэба звяртаць на тэхнічную, тэхналагічную і педагагічную якасць прэзентацыі. Інфармацыя павінна забяспечваць станоўчую матывацыю малодшых школьнікаў, развіваць іх эмацыянальную сферу, колькасць матэрыялу павінна быць невялікай. Спецыялісты лічаць, што ў 4 класе пачатковай школы працягласць дэманстрацыі мультымедыйных слайдаў не павінна перавышаць 15-20 хвілін, а аптымальная колькасць кадраў складае 8-12 [1, 23]. Пры стварэнні мультымедыйнай прэзентацыі для ўрокаў "Мая Радзіма – Беларусь" неабходна выконваць наступныя патрабаванні: на слайдзе размяшчаць мінімальную колькасць слоў; выкарыстоўваць дакладны і буйны шрыфт; словы, тэрміны, вызначэнні, якія навучэнцы будуць запісваць у сшыткі, прачытваць ўслых; фон слайда заліваць спакойным колерам; фотаздымкі, малюнкі, схемы павінны мець максімальны памер і раўнамерна запаўняць поле слайда; слайд не перагружаць зрокавай інфармацыяй; на прагляд слайда адводзіць дастатковую колькасць часу (2-3 хвіліны); гукавае суправаджэнне слайда не павінна мець рэзкі, раздражняючы характар; фотаздымкі і малюнкі павінны быць добрай якасці.

На ўроках "Мая Радзіма – Беларусь" мэтазгодна выкарыстоўваць мультымедыйныя прэзентацыі аб гістарычных асобах (К. Тураўскі, Ф. Скарына, С. Будны, Рагнеда, У. Чарадзей, Е. Полацкая, Вітаўт, Л. Сапега, інш.), аб падзеях і з'явах беларускай гісторыі ("У краіне майстроў", "У што верылі нашы продкі", "Песняр сялянскай долі", "Славутыя дзеячы навукі і культуры", "Будаўніцтва новага жыцця", "Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны і інш.). У склад гэтых мультымедыйных прэзентацый абавязкова трэба ўключаць краязнаўчы матэрыял. Напрыклад, у прэзентацыю "Будаўніцтва новага жыцця" навучэнцы каледжа ўключаюць матэрыялы аб будаўніцтве Аршанскага ільнокамбіната, "Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны" – матэрыял аб аршанскіх піянерах, якія былі ўдзельнікамі падпольнага і партызанскага руху.

Мультымедыйная прэзентацыі і відэафільмы дапамагаюць настаўніку рэалізаваць дыдактычныя мэты ўрока: навучальную (фарміраванне у вучняў гістарычных вобразаў і паняццяў); развіваючую (развіццё пазнавальнага інтарэсу, інтэлектуальных уменняў і творчасці); выхаваўчую (выхаванне грамадзянскага светапогляду і патрыятызму). Таму пры планаванні прымянення мультымедыйнай прэзентацыі трэба прытрымлівацца наступных правіл: вызначыць мэтазгоднасць выкарыстання мультымедыйнай прэзентацыі на ўроку; прааналізаваць магчымасці камп'ютарнага асяроддзя для стварэння прэзентацыі да ўрока; вызначыць месца работы з прэзентацыяй у структуры ўрока; спалучыць прэзентацыю з метадычнымі прыёмамі;прадумаць змястоўную і тэхнічную састаўляючую прэзентацыі; спрагназаваць вынікі навучання пры выкарыстанні мультымедыйнай прэзентацыі на ўроку. Неабходна навучыць будучых настаўнікаў распрацоўваць сістэму заданняў для вучняў, якія забяспечаць эфектыўнасць выкарыстання мультымедыйных прэзентацый пры фарміраванні гістарычных ўяўленняў малодшых школьнікаў. Напрыклад, на ўроку "Пад сценамі старажытных замкаў" выкарыстоўваецца мультымедыйная прэзентацыя "Старажытныя замкі Беларусі". Перад дэманстрацыяй вучням прапаноўваецца заданне: "Знайдзіце ў атласе на карце "Архітэктурныя помнікі Беларусі" замкі, пра якія вы даведаліся з прэзентацыи і вызначце, у якой вобласці Беларусі яны знаходзяцца". Пасля дэманстрацыі прэзентацыі вучні выконваюць заданне. Мультымедыйныя прэзентацыі і відэафільмы навучэнцы каледжа выкарыстоўваюць у час педагагічнай практыкі ў пачатковай школе. У 2014/2015 навучальным годзе 94 % навучэнцаў-практыкантаў выкарыстоўвалі мультымедыйныя прэзентацыі на пробных уроках і ў час пераддыпломнай практыкі. Яны адзначылі станоўчы ўплыў мультымедыйных сродкаў на засваенне гістарычных з'яў і асоб, актывізацыю пазнавальнай актыўнасці вучняў на ўроку.

**Заключэнне.** У працэсе вывучэння методыкі выкладання гістарычнай прапедэўтыкі, педагагічнай практыкі і даследчай дзейнасці будучыя настаўнікі ўпэўніваюцца, што выкарыстанне мультымедыйных прэзентацый на ўроках "Мая Радзіма – Беларусь" садзейнічае

Рэпазіторый ВГУ

выніковасці пазнавальнай дзейнасці малодшых школьнікаў, засваенню імі гістарычных ведаў, развіццю наглядна-вобразнага мыслення, рашэнню задач патрыятычнага выхавання.

Спісак літаратуры
1. Информационные технологии в образовании / авт. сост. О.А. Минич. – Минск: Красико-Принт, 2008. – 176 с.
2. Электронные образовательные ресурсы в работе с младшими школьниками и родителями // Пачатковая школа. – 2011. – № 7. – С. 65–68.

## АНАЛИЗ ПРОБЛЕМ ОРГАНИЗАЦИИ И РЕАЛИЗАЦИИ ПРОЕКТНОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ

*Ю.А. Игошина, М.Ф. Кунтыш*
*Витебск, ВГУ имени П.М. Машерова*

Проектная деятельность в начальной школе позволяет формировать различные компетенции: навыки работы в сотрудничестве, коммуникативные, рефлексивные, поисковые и другие умения. Метод проектов постепенно находит свое место в современной школе и позволяет вовлекать каждого ребенка в образовательный процесс, предоставляя возможность раскрыть свой потенциал в том или ином виде деятельности. Однако, организация и реализация проекта требует основательной подготовки как учителя, так и учеников. И, в связи с этим, может возникнуть ряд проблем, затрудняющих использование метода проектов в начальной школе. Актуальность обусловлена необходимостью поиска рациональных решений проблем для реализации проектной деятельности.

Цель исследования – анализ основных проблем, возникающих в организации и реализации проектной деятельности.

**Материал и методы.** Материалом для анализа послужила научная литература, статьи и публикации, а также опрос и анкетирование учителей начальной школы и учеников 3-х классов. В процессе исследования применялись методы опроса, анализа, проекта.

**Результаты и их обсуждение.** Одной из проблем организации проектной деятельности является неспособность учеников взаимодействовать друг с другом, низкий уровень коммуникативных умений. В начальных классах была внедрен адаптированный и модифицированный вариант методики Г.В. Бурменской «Совместная сортировка» с целью оценки коммуникативных действий по согласованию усилий в процессе организации и осуществлении сотрудничества. В исследовании приняли участие 40 учеников 3-х классов – 20 пар. Ученикам, сидящим парами, предлагаются группы слов – имен существительных и имен прилагательных для сортировки согласно заданным условиям. Необходимо сопоставить слова из первой и второй групп, предварительно договорившись между собой и объяснив письменно свой выбор. Проанализировав результаты согласно критериям оценки были сделаны следующие выводы: из 20 пар, принимавших участие в исследовании, высокий уровень продуктивности совместной деятельности показали 7 пар учеников, средний уровень – 8 пар, низкий уровень – 3 пары, 4 ученика отказались взаимодействовать между собой, игнорируя друг друга, при этом не показав результатов.

Глядя на данные результаты можно сделать вывод о том, что необходимо искать способы сплочения ученического коллектива, развивать способность работать в парах, тем самым подготавливая к работе в группах, поскольку метод проектов, как правило, предполагает такую форму взаимодействия.

Опрос и анкетирование учителей начальной школы показал, что чаще всего для достижения этой цели используются внеурочные мероприятия, совместная деятельность по благоустройству класса и пришкольных участков, выбор органов самоуправления. Чаще всего ученикам, конфликтующим между собой, предлагается общая цель, задание, выполнение которого предполагает совместную деятельность. Именно общая цель позволяет находить общий язык, искать всевозможные пути решения.

При непосредственной организации для эффективной и продуктивной работы над этапами проекта учителю необходимо правильно объединить младших школьников в группы для совместной проектной деятельности. Чаще всего, учителя предпочитают разделение на группы путем объединения уже сформированных пар, либо предлагают ученикам объединиться самостоятельно, однако такое разделение может оказаться непродуктивным, группы могут получиться неравноправными. Учителю следует проанализировать способности каждого ученика,

Репозиторий ВГУ